Праект на тэму «Абмен валют» падрыхтаваны Беларускім народным банкам дзеля знаёмства вучняў з асобнымі элементарнымі эканамічнымі паняткамі, з якімі навучэнцы сутыкаюцца ў штодзённым жыцці. Напрыклад, «Што такое валюта і навошта яна патрэбна?», «Як абмяняць валюту?». Падчас прагляду навучэнцы атрымліваюць базавыя эканамічныя веды па дадзенай тэме ў гульнявой форме.

Праект можа быць скарыстаны для правядзення інтэрактыўных навучальных мерапрыемстваў настаўнікамі пачатковых класаў ці класнымі кіраўнікамі ў гімназіях і школах; для інсцэнавання дзецьмі дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. А таксама для індывідуальных хатніх заняткаў з дзецьмі.

Праект распрацаваны ў рамках праграмы Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь «Фінансавая пісьменнасць насельніцтва».

# ПРЫГОДЫ ЛЬВА ЛЯВОНА

# «АБМЕН ВАЛЮТ»




БРР... Я ЗМЕРЗ.
ТАК ХОЧАЦЦА Ў АФРЫКУ...


У АФРЫЦЫ МНЕ СПАТРЭБЯЦЦА АФРЫКАНСКІЯ ГРОШЫ. ЗНАЧЫЦЬ, ТРЭБА ЗАЙСЦІ Ў БАНК.
БАНК


БАНК
БАНК – СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ЎСТАНОВА, ЯКАЯ ЗАЙМАЕЦЦА РОЗНЫМІ ГРАШОВЫМІ АПЕРАЦЫЯМІ, У ТЫМ ЛІКУ І АБМЕНАМ ВАЛЮТ.


ГРОШЫ АДНОЙ ДЗЯРЖАВЫ БАНКІ АБМЕНЬВАЮЦЬ НА ГРОШЫ ІНШАЙ ДЗЯРЖАВЫ – ГЭТА НАЗЫВАЕЦЦА АБМЕНАМ ВАЛЮТ.
АБМЕН ВАЛЮТ
ЧАС
15:25:42
ДАТА
15.02.2014
НАБЫЦЦЁ
ПРОДАЖ
USD 9500 9600
EGP 1357 1378
RUB 284.5 289
UAH 1050 1150
LTL 3900 4050
PLZ 3116 3289
ПЕРАД НАБЫЦЦЁМ ВАЛЮТЫ МОЖНА ПАГЛЯДЗЕЦЬ НА ЭЛЕКТРОННАЕ ТАБЛО І ДАВЕДАЦЦА, КОЛЬКІ ЯНА КАШТУЕ.






**ВАЛЮТА** – ГРОШЫ РОЗНЫХ КРАІН СВЕТУ. ВАЛЮТА БЫВАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ – ТОЙ КРАІНЫ, ДЗЕ ТЫ ЖЫВЕШ, І ЗАМЕЖНАЯ – ГРОШЫ ІНШЫХ КРАІН.

У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ВАЛЮТА – БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ.


ВАЛЮТУ МОГУЦЬ НАБЫВАЦЬ ТОЛЬКІ ТЫЯ, У КАГО ЁСЦЬ ПАШПАРТ.
ПАШПАРТ
ЧАС 15:25:42
ДАТА 15.02.2014
НАБЫЦЦЁ
ПРОДАЖ
USD 9500 9600
EGP 1357 1378
RUB 284.5 289
UAH 1050 1150
LTL 3900 4050
PLZ 3116 3289
АБМЕН ВАЛЮТ
ДОБРЫ ДЗЕНЬ!
ПРЫВІТАННЕ! МНЕ ПАТРЭБНА 100 АФРЫКАНСКІХ ГРОШАЙ.
ГРОШЫ ІНШЫХ КРАІН ПРАДАЕ КАСІР



РАЗАМ З ПАШПАРТАМ КАСІРУ ТРЭБА ДАЦЬ І СУМУ ГРОШАЙ, ЯКУЮ ЁН ТАБЕ НАЗАВЕ.
сто тысяч рублёў
100 000
ЧАС
15:25:42
ДАТА
USD 9500
EGP 1357
RUB 284.5
UAH 1050
LTL 3900
PLZ 3116
АБМЕН ВАЛЮТ
ВАШ ПАШПАРТ, КАЛІ ЛАСКА.
ВУШЫ, ЛАПЫ ДЫ ХВОСТ-ВОСЬ МОЙ ПАШПАРТ!



КАЛІ КАСІР СКОНЧЫЦЬ АПЕРАЦЫЮ, ЁН АДДАСЦЬ ТАБЕ:
1 – КАСАВЫ ЧЭК, Ў ЯКІМ НАПІСАНА КАЛІ І КОЛЬКІ ГРОШАЙ ТЫ НАБЫЎ
2 – ТВОЙ ПАШПАРТ
3 – ГРОШЫ, ЯКІЯ ТЫ НАБЫЎ
КАСАВЫ ЧЭК Ń 1212
ДАТА 14.02.2014 ЧАС 11:57:40
ПРОДАЖ ВАЛЮТЫ
ТЫП ВАЛЮТЫ, ЯКАЯ НАБЫВАЕЦЦА
КОЛЬКАСЦЬ
АФРЫКАНСКІЯ ГРОШЫ
100
РАЗАМ ВЫДАДЗЕНА: 100 АФРЫКАНСКІХ ГРОШАЎ
СТО АФРЫКАНСКІХ ГРОШАЎ
КАСІР
1
2
ПАШПАРТ
3
100


АБМЕН ВАЛЮТ
БАНК
КАСІР
НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ВАЛЮТА
ЗАМЕЖНАЯ ВАЛЮТА
КАСАВЫ ЧЭК
ЭЛЕКТРОННАЕ ТАБЛО
ЗАРАЗ Я ВЕДАЮ НОВЫЯ СЛОВЫ!
І Ў МЯНЕ ЁСЦЬ АФРЫКАНСКІЯ ГРОШЫ ДЛЯ ПАЕЗДКІ Ў АФРЫКУ!

**БАНК** – СПЕЦЫЯЛЬНАЯ УСТАНОВА, ЯКАЯ ЗАЙМАЕЦЦА РОЗНЫМІ ГРАШОВЫМІ АПЕРАЦЫЯМІ, У ТЫМ ЛІКУ І АБМЕНАМ ВАЛЮТ.

**АБМЕН ВАЛЮТ** – АБМЕН ГРОШАЙ АДНОЙ ДЗЯРЖАВЫ НА ГРОШЫ ІНШАЙ ДЗЯРЖАВЫ.

**ВАЛЮТА** – ГРОШЫ РОЗНЫХ КРАІН СВЕТУ.

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ВАЛЮТА** – ГРОШЫ ТВАЁЙ КРАІНЫ.

**ЗАМЕЖНАЯ ВАЛЮТА** – ГРОШЫ ІНШЫХ КРАІН.

**КАСІР** – СУПРАЦОЎНІК БАНКА, У ЯКОГА ТЫ МОЖАШ АБМЯНЯЦЬ ВАЛЮТУ.

**ЭЛЕКТРОННАЕ ТАБЛО** – ПРЫЛАДА, НА ЯКОЙ АДЛЮСТРАВАНЫ КОШТ ВАЛЮТЫ.

**КАСАВЫ ЧЭК** – КВІТАНЦЫЯ, У ЯКОЙ НАПІСАНА КАЛІ І КОЛЬКІ ГРОШАЙ ТЫ АБМЯНЯЎ.




© БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК